Источник: "Літаратура і мастацтва" – 2014-03-07

*Ракурс*

# Імя вуліцы

**Адбылося пасяджэнне Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якое выклікала розгалас не толькі ў акадэмічным асяроддзі.**

На пасяджэнні абмяркоўвалі папраўкі да Закона «Аб найменнях геаграфічных аб'ектаў», прычым гэта ўжо не першая спроба ўнесці змены. Першую папраўку тапанімічная камісія адхіліла па зразумелай прычыне: калі б яе прынялі, то назвы геаграфічным аб'ектам можна было даваць не толькі на беларускай мове, але і на рускай. У такім разе мы б займелі карціну надзвычай непрыемную: беларускія гарады «ўпрыгожылі» б вуліцы Жалезнадарожная, Цвяточная, Красівая і да т. п. Ігар Капылоў, новы старшыня тапанімічнай камісіі, які і рабіў даклад, прывёў яскравы прыклад. Да прыняцця вышэйзгаданага Закона ў 2010 годзе назвы даваліся толькі па-беларуску і перакладаліся на рускую: Працоўная — Трудовая. Пасля прыняцця Закона назвы даюцца на беларускай мове і шляхам транслітарацыі перадаюцца на рускую: Працоўная — Працовная.

Вядомы мовазнаўца, членкарэспандэнт АН Беларусі Аляксандр Лукашанец, які рыхтаваў афіцыйную паперу з адмовай прыняцця першай папраўкі, зазначыў: «Новыя папраўкі ўзнікаюць адно таму, што дзяржаўныя служачыя не ведаюць беларускай мовы, а значыць — не адпавядаюць патрабаванням і не могуць займаць свае пасады, бо дзяржслужачы павінен валодаць як рускай, так і беларускай мовамі».

Што ж прапануе Дзяржаўны камітэт па маёмасці, ад імя якога і прапануюцца новыя папраўкі? У новай папраўцы першым пунктам заяўляецца, што назвы геаграфічным аб'ектам могуць давацца толькі на беларускай мове. У наступным жа пункце прапісана: «Правілы і спосабы перадачы найменняў геаграфічных аб'ектаў з беларускай мовы на рускую, **з рускай мовы на беларускую**, а таксама з беларускай і рускай моў на іншыя мовы вызначаецца Дзяржаўным камітэтам па маёмасці Рэспублікі Беларусь». Абурэнне камісіі выклікала вылучаная намі фраза. У выніку, пасля доўгай і бурнай дыскусіі, другі пункт прынялі, выкрэсліўшы супярэчлівае палажэнне.

Прадстаўніца камітэта па маёмасці прызналася, што папраўкі да Закона на гэты момант перададзеныя на разгляд у парламент. Таму да вынесенай рэзалюцыі камісія далучыла просьбу дазволіць ім прысутнічаць на разглядзе направак да Закона, каб мецьмагчымасць патлумачыць, што і чаму прымаць нельга.

На пасяджэнні абмяркоўваліся не толькі папраўкі да Закона, але і больш шырокія пытанні. Падрабязней чытайце ў наступным нумары.

**Анастасія ГРЫШЧУК**

Анастасія Грышчук. Імя вуліцы